**Мельнікава З.П.**
(Брест, Беларусь)

# ПРАВЕДНАСЦЬ АСЭНСАВАННЕ ТРАГІЧНЫХ СТАРОНАК АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ Ў ТВОРЧАСЦІ А. САЛЖАНІЦЫНА І В. БЫКАВА

***Ключавыя словы:*** *ідэйна-філасофскія традыцыі, інтэлектуальна-культурны вопыт, маральна-філасофская канцэптуальнасць, эстэтычны вопыт "шасцідзясятніцтва", экзістэнцыйны выбар, чалавек і абставіны, гуманістычны ідэал, трагедыйнасць быцця, мастацкі рэквіем.*

***Анатацыя:*** *Выяўлены тыпалагічныя сыходжанні асобных твораў літаратурнай спадчыны рускага пісьменніка А. Салжаніцына і шэрагу мастацкіх твораў беларускага пісьменніка В. Быкава. Устаноўлена падабенства ідэйна-філасофскіх пазіцый, роля асабістага вопыту аўтараў-франтавікоў у асэнсаванні прычын трагедый і вялікіх ахвяр вайны, а таксама пры ўвасабленні канцэпцыі чалавек і абставіны (аповесці А. Салжаніцына "Адліг Швенкіттэн", В. Быкава "Мёртвым не баліць", "Сотнікаў"). Падкрэслена маральна-філасофская ацэначнасць, сарыентаванасць на гуманістычныя ідэалы рускага і беларускага пісьменнікаў пры літаратурна-мастацкім даследаванні "гулагаўскай" тэмы (А. Салжаніцын "Адзін дзень Івана Дзянісавіча", "Архіпелаг ГУЛаг", В. Быкаў "Аблава"). Абодва пісьменнікі сцвярджаюць маральную трываласць і духоўную годнасць чалавека як неадменны гуманістычны імператыў (ідэал).*

А. Салжаніцын (1918 – 2008) і В. Быкаў (1924 – 2003) належаць да аднаго пісьменніцкага пакалення, якое настойліва і мужна несла ў савецкую літаратуру пафас праўды аб сацыяльна-палітычнай гісторыі вялікай краіны СССР, аб войнах і трагедыях эпохі савецкага таталітарызму. "Жить не по лжи!" і "Праўдай адзінай" – жыццёвыя і творчыя прынцыпы А. Салжаніцына і В. Быкава сталі не толькі ідэйна-эстэтычнымі арыенцірамі для савецкай літаратуры пакалення "шасцідзясятнікаў", але і сёння, у пачатку ХХ1 ст. па-ранейшаму вызначаюць сутнасць жыцця і прызначэння кожнага сумленнага мастака. Сугучнасць ідэйна-філасофскіх традыцый гэтых вялікіх пісьменнікаў абумоўлена падобным, а часам і агульным вопытам перажытага. Яны абодва былі франтавікамі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Старэйшы А. Салжаніцын, праўда, сустрэў перамогу пад арыштам, на Лубянцы, куды яго, маладога афіцэра, капітана, у лютым 1945 г. даставілі з фронту. Ваенныя цэнзары ў яго перапісцы з сябрам М. Віткевічам знайшлі крамолу: пад мянушкамі "Воўка" і "Пахан" сябры, сапраўды, мелі на ўвазе Леніна і Сталіна. Так у пераможным 45-м годзе А. Салжаніцын быў асуджаны на восем гадоў лагераў "за агітацыю і прапаганду" і атрымаў першы, але не апошні ўласны лагерны вопыт, што потым дасць багаты матэрыял для творчасці пра архіпелаг ГУЛаг і закінутыя ў лагеры лёсы мільёнаў людзей.

Беларускі пісьменнік В. Быкаў ваяваў на 2-м і 3-м Украінскіх франтах. Ён пазнаў не толькі героіку і трагедыю вайны, але і маральную, духоўную веліч чалавека на вайне, у супрацьстаянні з непераадольнымі абставінамі. Пазней пісьменнік напіша, што савецкія людзі не толькі перамагалі фашызм, але даказалі самім сабе і ўсяму чалавецтву нязломнасць, незнішчальнасць

чалавечай годнасці. Зімой 1944 г. у баях пад Кіраваградам паранены малодшы лейтэнант В. Быкаў цудам уратаваўся з-пад гусеніц фашысцкіх танкаў, адыходзячы праз міннае поле. Але яго бацькі атрымалі "пахаронку". Гэтыя падзеі апісаны пісьменнікам у аповесці "Мёртвым не баліць". В. Быкаў ваяваў далей і вызваляў Румынію, Венгрыю, Югаславію, Аўстрыю.

Памяць аб вайне і аб мільёнах загінуўшых абавязвала пісьменнікаў ваеннага пакалення А. Салжаніцына, Д. Граніна, В. Быкава, В. Астафьева, В. Някрасава, Я. Брыля, А. Адамовіча і многіх іншых расказваць праўду аб вайне і перамозе. Яны добра ведалі і горка ўсведамлялі, якіх непамерна вялікіх страт каштавала перамога, што самым танным на вайне было, на жаль, жыццё чалавека. Пісьменнікі, удзельнікі вайны, часта сам-насам сутыкаліся са смерцю. Нават бязбожныя душы ў такія моманты звярталіся да Усявышняга, а выжыўшы цудам, прыходзілі да Веры. Праваслаўнымі вернікамі сталі А. Салжаніцын і В. Быкаў.

Імёны А. Салжаніцына і В. Быкава стаяць побач у свядомасці і інтэлектуальна-культурным вопыце кожнага адукаванага чалавека. Праніклівыя мысляры, сумленныя, таленавітыя пісьменнікі, барацьбіты супраць таталітарызму, яны мелі мужнасць выказваць праўду ў мастацкіх творах, у публіцыстыцы, інтэрв'ю, эсэістыцы. Прыхільнікі рэфарматарскіх шляхоў абнаўлення грамадства, абодва не аблашчаныя ўладамі, са сваімі мужнымі і праўдзівымі творамі А. Салжаніцын і В. Быкаў застаюцца і сёння "на бестэрміновай перадавой" (А. Адамовіч) змагання за сумленнасць, духоўнасць у чалавеку і грамадстве.

Пазнанне вайны праз асабісты вопыт адлюстравалася ў большасці твораў беларускага пісьменніка В. Быкава, асабліва ў яго "франтавых" аповесцях "Жураўліны крык", "Дажыць да світання", "Здрада", "Пастка", "Трэцяя ракета", "Мёртвым не баліць" і інш. У спадчыне А. Салжаніцына таксама ёсць творы "франтавой" тэмы. Гэта – некаторыя апавяданні 90-х гг., а таксама "маленькая аповесць" (так вызнач*а*ў жанравыя асаблівасці некаторых сваіх твораў і В. Быкаў) "Адліг Швенкіттэн". У названых творах абодвух пісьменнікаў не толькі выяўляюцца драматычныя і трагічныя эпізоды вайны, але і востра пастаўлены маральна-філасофскія пытанні: чаму часта перамагае зло? Чаму духоўнае, маральнае часта аказваецца бездапаможным перад карыслівым, здрадніцкім, цынічным? Абодва пісьменнікі ў названых творах паўстаюць "бязлітаснымі рэалістамі" і аналітыкамі. Незабыўныя, балючыя ваенныя ўражанніператвараліся ў творчыя задумы – расказаць аб трагічным лёсе свайго загінуўшага пакалення, аб тым, што паражэнні і перамогі на вайне былі абумоўлены і перадваеннай гісторыяй, што невымерныя страты і ахвяры часам былі марнымі, што чалавечым жыццём найменей даражылі на вайне.

У аповесці *А. Салжаніцына "Адліг Швенкіттэн"* расказваецца аб апошнім перыядзе вайны, аб баях ва Усходняй Прусіі ў студзені 1945-га года. Камандзіры выпраўляюць брыгаду зімовай ноччу на стратэгічна неабдуманае перамяшчэнне. А самі штабісты "расслабіліся" за гарачай вячэрай і нават адключылі сувязь. Пісьменнік паказаў, што па сутнасці па віне камандзіраў бессэнсоўна трагічна загінулі лепшыя салдаты і афіцэры, мужныя і сумленныя

людзі. Падобныя сюжэты сустракаюцца ў шэрагу твораў беларускага пісьменніка В. Быкава: “Мёртвым не баліць”, “Пастка”, “Праклятая вышыня”. Ваенныя, як і “гулагаўскія”, выпрабаванні з пераканаўчай выразнасцю выяўлялі маральную і духоўную сутнасць чалавека.

У 60-я гады ХХ ст. следам за аповесцю “Адзін дзень Івана Дзянісавіча”, надрукаванай у 1962 г. у часопісе “Новый мир”, з’явілася ў друку аповесць *В. Быкава “Мёртвым не баліць”* у беларускім часопісе “Маладосць” (1965). Рэдактара часопіса П. Панчанку пасля папракалі за рызыкоўную “смеласць”, бо ў творы закраналіся праблемы, аб якіх яшчэ не прынята было гаварыць і пісаць: пра здраду і баязлівасць на вайне, пра адмоўныя вынікі культу асобы. А пісьменніка папракалі за залішняе згушчэнне трагізму і “дэгераізацыю”. Некаторыя крытыкі назвалі гэты быкаўскі твор “літаратурнай дыверсіяй”. В. Быкаў падкрэсліваў, што гэтая аповесць аўтабіяграфічная, а сюжэт узяты з уласнага франтавога вопыту, што ў герояў твора былі прататыпы – звычайныя байцы, якія выяўлялі гераізм і самаахвярнасць. Героі аповесці па віне бяспечных камандзіраў апынуліся ў акружэнні. Яны намагаюцца супрацьстаяць фашысцкім танкам, падбіць іх, хоць зусім не былі гатовыя да такога бою. Праяўляючы гераізм і самаахвярнасць, яны змагаюцца да апошняга ў найскладаных абставінах, каб спыніць нечаканую танкавую атаку. У выніку злачыннай абыякавасці камандзіраў гінуць сябры галоўнага героя Васілевіча, ад імя якога перадаюцца падзеі. На мінным полі, дзе байцы аказаліся па віне камандзіра Сахно, гіне медсястра Каця Шчарбенка.

Васілевіч, якому аўтар дадае найбольш з перажытага ім пад Кіраваградам, – адзін з многіх параненых. З таварышамі ён вымушаны прабірацца праз міннае поле. Нікому не хочацца паміраць ні пад гусеніцамі фашысцкіх танкаў, ні ўзрывацца на міне. Але ў безвыходнай сітуацыі ваеннага абсурду герой гатовы і да гібелі. Сахно ж выпраўляе наперад малодшых па званні, імкнучыся ўберагчы сябе. В. Быкаў выяўляе і асуджае бездухоўнасць прыстасаванцаў да вайны, такіх, як афіцэры Сахно і Гарбацюк. “Жалезны” характар Сахно накіраваны на падначаленых, для якіх ён і жорсткі, і бязлітасны. Такія, як Сахно, паказаў В. Быкаў, не кідаліся пад танкі, не ахвяравалі сабой дзеля перамогі, а толькі пасылалі наперад іншых.

У заключным раздзеле твора, прысвечаным пасляваеннаму жыццю, пісьменнік-мысляр В. Быкаў выказвае аптымістычную веру, што будучыня наступіць без такіх тыпаў, як Сахно і Гарбацюк. Вайна, гібель дарагіх сяброў і мноства сумленных людзей не пазбавілі душу героя пяшчоты і чалавечнасці. Назіраючы за мірным жыццём, за сямейнымі і закаханымі парамі, герой-апавядальнік Васілевіч думае: “… хто і якія б гэтыя людзі ні былі – ім належыць будучыня, і ў тым іх перавага. Ім ствараць яшчэ ненапісаную гісторыю краіны. У загадкавым заўтра прадаўжаць жыццё. Іх чалавечнасць і мужнасць будуць вызначаць лёсы зямлі [1, с. 360].

А. Салжаніцын і В. Быкаў у 60 –70-я гг. разам з іншымі прадстаўнікамі савецкага пакалення пісьменнікаў, якія пазналі вайну праз асабісты вопыт (Ю. Бондараў, А. Бакланаў, А. Ананьеў, К. Сіманаў, А. Бек, І. Мележ, І. Шамякін, інш.) выяўлялі ў сваіх творах прынцыповую грамадзянскую

пазіцыю ў адлюстраванні вайны. На выдатным веданні рэальных абставін імі былі закладзены *традыцыя і эстэтыка праўдзівага адлюстравання героікі і трагедыі вайны.* Гэта станавілася творчым арыенцірам для іншых пісьменнікаў, асабліва пры даследаванні маральна-духоўных матываў паводзін чалавека на вайне.

Непрыманне маральна нізкага, якое хаваецца за маскай "героікі" ці звычайнай прыстойнасці, заўсёды было ўласціва рускаму і беларускаму пісьменнікам-мыслярам. Нават у творах аб вайне А. Салжаніцына і В. Быкава шукаюцца адказы на вечныя пытанні быцця. Якая цана на вайне жыццю? Ці не злачынна ўсе трагедыі спісваць на вайну? Права на які выбар чалавек мае, а на які не мае нават у непераадольных абставінах вайны? Якім павінен быць выбар паміж жыццём і гонарам?

Беларускі пісьменнік В. Быкаў мноства разоў ставіў гэтыя пытанні ў сваіх творах, па-філасофску даследуючы духоўныя і маральна-псіхалагічныя магчымасці чалавека. Маральна-філасофская праблема выбару між жыццём і гонарам асабліва ўзмоцнена прагучала ў аповесці *"Сотнікаў" (1970).* У гэтым прыпавесційным творы на ваенным матэрыяле пісьменнік паказвае сутыкненне духоўнага пачатку чалавека з яго натуральным і зразумелым імкненнем захаваць фізічнае жыццё. Невыпадкова фільм "Узыходжанне" расійскага рэжысёра Л. Шэпіцька, зняты па гэтай аповесці В. Быкава, адразу папаў пад забарону, хоць у аснову сюжэта аповесці і фільма пакладзены евангельскі сюжэт аб здрадзе, як адзін "прадае" другога.

Героі ваенных твораў В. Быкава ваююць не толькі зброяй, а сваім моцным характарам, духам супрацьстаяць бесчалавечнасці. Гэта ў поўнай меры адносіцца да аповесці В. Быкава "Сотнікаў", твора аб велічы чалавечага духу: на што здольны чалавек, як ён будзе сябе паводзіць, калі выратаваць жыццё ўжо немагчыма?..

Праз вобразы і лёсы герояў твора пісьменнік-мысляр пераконвае: трэба жыць сумленна, з адказнасцю за кожны нават дробязны ўчынак; заставацца сумленным і маральным на вайне, перад непазбежнай смерцю – гэта гераізм; нельга ісці на кампрамісы з сумленнем нават, здавалася б, у нязначным, дробязным; кожная здрада сумленню і агульначалавечай, хрысціянскай маралі, хаця б і дзеля ўратавання ўласнага фізічнага існавання за кошт жыцця, здароўя, інтарэсаў іншага чалавека – гэта ганьба і грэх. Яны вядуць непазбежна да духоўнага падзення асобы, да жыццёвага паражэння таго, хто імкнецца шляхам здрады, амаральнага ўчынку займець уласную выгоду ці ўратаваць сябе. Гэта і складае праблематыку і ідэйна-філасофскі змест аповесці. Адна з асноўных праблем твора – чалавечая вартасць, мера духоўнай і маральнай трываласці чалавека ў непераадольных абставінах, у моманты галоўнага жыццёвага выпрабавання, калі даводзіцца глядзець у вочы смерці.

На сюжэце-эпізодзе з ваеннага, партызанскага супраціўлення ва ўмовах акупацыі пісьменнік уздымае філасофскую праблему складанага маральнага выбару. Двое партызан, Рыбак і Сотнікаў, атрымалі заданне: раздабыць хоць нейкі харч для атрада, які ўжо тыдзень не мае ежы, амаль з усіх бакоў

акружаны карнікамі; многія партызаны параненыя і прастуджаныя, і ўжо закончылася паранае жыта, якім ратаваліся ад голаду…

Але каштоўнасць твора заключаецца не толькі ў майстэрскім адлюстраванні трагічнай ваеннай сітуацыі, а ва ўніверсалізме, заўсёднай актуальнасці ўзнятай аўтарам праблемы. Сітуацыі выбару ўзнікаюць не толькі на вайне, а паўстаюць перад кожным з нас і ў мірны час, і амаль кожны дзень.

Расказваючы пра драматызм выбару перад небяспекай смерці ў бязлітасных абставінах вайны, В. Быкаў узвышае маральную нязломнасць ледзь жывога, параненага і закатаванага карнікамі Сотнікава. Пісьменнік як бы спачувае дужаму і ўдачліваму да апошняга правалу на заданні Рыбаку, які, ратуючы ўласнае жыццё, згаджаецца на ганебную здраду і ўдзел разам з паліцаямі і фашыстамі ў смяротным пакаранні сябра-партызана. Намагаючыся застацца жывым, Рыбак не думае, што яго, як і кожнага здрадніка і забойцу, непазбежна напаткае кара.

Большасць герояў твораў В. Быкава, як і Сотнікаў, моцныя сваім характарам, маральнай і духоўнай нязломнасцю здольныя супрацьстаяць смерці і бесчалавечнасці. Яны ніколі не пераступаюць мяжу, за якой канчаюцца чалавечнасць, культура і маральнасць, якую, на жаль, пераступіў Рыбак.

Для мастацкага ўвасаблення задумы аб маральнай і духоўнай нязломнасці чалавека перад неадольнымі бесчалавечнымі абставінамі акрамя вобраза чалавека-адступніка, Рыбака, пісьменніку спатрэбіўся вобраз яго антыпода, чалавека моцнай волі – Сотнікава. Менавіта Сотнікаў перамог абставіны, узвысіўся над імі сілай і веліччу мужнасці, духоўнасці, гераізму. Гэтаму вобразу адведзена цэнтральнае месца ў творы, бо менавіта Сотнікаў задумваецца над пытаннямі, што цікавяць пісьменніка, і дае адказ на іх сваёй гераічнай смерцю.

Абставіны скла́ліся самым трагічным чынам. Сотнікаў і Рыбак трапілі ў фашысцкі палон, дзе з іх здзекуецца «банда наймітаў», паліцаяў. Яны разумеюць, што выйсце адсюль для іх толькі адно — памерці з годнасцю. Гэта адзіны спосаб даказаць сваю непадуладнасць абставінам. Але чаму гэтым трагічным шляхам пайшоў толькі Сотнікаў? Адказ на пытанне даецца ў паслядоўнай, псіхалагічна дакладнай параўнальнай характарыстыцы герояў, якую пісьменнік праводзіць з вялікай увагай да кожнай падрабязнасці ў даваенных лёсах, у размовах, паводзінах Сотнікава і Рыбака. Яны разам выйшлі на заданне, былі добрымі знаёмымі, іх аб’ядноўвалі ўзаемная сімпатыя і адна мэта. Але мы бачым, што ў канцы аповесці іх дарогі і лёсы разышліся назаўсёды. Гэта ўжо зусім розныя людзі. Сотнікава павесілі фашысты, а Рыбак стаў здраднікам-паліцаем.

Сотнікаў — былы камбат Савецкай Арміі. Закончыў настаўніцкі інстытут, працаваў у школе, служыў у войску. Яму, як і Рыбаку, дваццаць шэсць год, але многае ён ужо пражыў і перажыў. У час вайны камандаваў батарэяй. Пра мінулае жыццё, дзяцінства і юнацтва толькі ўспамінаецца. У памяці Сотнікава жыве нядаўняе мінулае: няроўны бой з танкамі, разгром палка, уцёкі з палону і цяперашнія падзеі партызанскага жыцця. У параўнанні з Рыбаком, які з захапленнем прыгадвае сваё нядаўняе каханне з хутаранкай Любкай, душа Сотнікава нічога не ўспрымае апроч вайны. Аднак было ў іх і агульнае:

армейскае мінулае і памятны бой у лесе, дзе яны выручылі адзін аднаго. У той раз мужнасць і адвага Сотнікава паслужылі Рыбаку прыкладам: іх дваіх і яшчэ аднаго партызана пакінулі ў заслоне, каб стрымаць фашыстаў і даць магчымасць партызанскаму атраду адарвацца. Рыбак і другі партызан, убачыўшы, што вакол многа ўзброеных фашыстаў, вырашылі, пакуль няпозна, ратавацца і пачалі ўцякаць. Сотнікаў жа не сышоў з месца, вёў па ворагу трапны агонь, прыкрываючы адыход таварышаў, што прымусіла фашыстаў залегчы… Рыбак, сабраўшыся з духам, таксама стаў страляць па ворагу. Мужнасць і вытрымка Сотнікава спынілі ганебныя ўцёкі Рыбака з поля бою. Пасля таго яны як бы пасябравалі: Рыбак быў удзячны свайму таварышу і цягнуўся да яго, хацеў быць такім жа валявым і стойкім.

Суровыя ўрокі вайны ўмацоўвалі волю Сотнікава, гартавалі яго здольнасць супрацiўляцца абставінам, ніколі не здраджваць сваім перакананням. З таго бою, калі быў разгромлены яго полк, а самому байцу ўдалося знішчыць чатыры варожыя танкі, Сотнікаў вынес правіла: змагацца, супраціўляцца трэба, нягледзячы ні на што, да апошняй магчымасці. Так ён ваяваў і ў партызанскім атрадзе.

Волю, рашучасць Сотнікава загартаваў і палон. Там ён пераканаўся: з тымі, хто адолеў страх смерці, фашысты ўжо нічога не могуць зрабіць. На ўсё жыццё ён запомніў, як у лагеры для ваеннапалонных ворагі дапытвалі сівога палкоўніка. Гэты чалавек быў пакалечаны ў баі, ледзь жывы, моцна пакутаваў ад фізічнага болю. Аднак гэтаму палкоўніку было невядома пачуццё страху за сваё жыццё. На допыце ён кідаў у твар гестапаўскаму афіцэру гнеўныя словы супраць Гітлера. Яго расстралялі, але тыя некалькі хвілін перад смерцю былі подзвігам, магчыма, большым, чым на полі бою. І ў сваім трагічным фінале Сотнікаў бярэ прыклад з мужнага палкоўніка. Сотнікаў выпадкова аказаўся побач за сцяной барака і на ўсё жыццё запомніў гэты допыт. Мужнасць і нязломнасць палкоўніка ён згадвае, апынуўшыся ў палоне.

Праявы гераізму ў характарах і паводзінах людзей заўсёды захаплялі Сотнікава. У апошнія хвіліны свайго жыцця ён успамінае і безыменнага, параненага палоннага лейтэнанта, які ўдарыў нажом канваіра. Сам лейтэнант з-за ранення ўцячы не мог, але хацеў даць шанс уратавацца іншым. Перад смерцю ў палоне Сотнікаў шкадуе, што яму не пашчасціла так загінуць, бо ў яго няма ні сілы, ні зброі. І ўсё ж ён спрабуе выратаваць тых людзей, з кім звёў лёс: старасту Пётру Качана, Дзёмчыху, яўрэйскую дзяўчынку Басю. Сотнікаў прызнаецца, што ён – партызан і што ён сам забіў паліцая, а ўсе астатнія – выпадковыя, ні ў чым не павінныя людзі.

Аўтар, апісваючы апошнія гадзіны Сотнікава, падкрэслівае, што герой ахвяраваў сабой дзеля выратавання іншых. Сотнікаў не згаджаецца з думкай, што яго смерць з'явіцца недарэчнай выпадковасцю. Як і кожная смерць у барацьбе, яна павінна нешта сцвярджаць, нешта адмаўляць і, па магчымасці, завяршыць тое, што не паспела здзейсніць жыццё. Аднак спадзяванне Сотнікава сваёй смерцю купіць выратаванне тым, хто быў побач, не ажыццявілася. Жаданне, каб і смерць стала вялікім учынкам, не збылося. Сотнікаў не спрабуе ўратаваць сваё жыццё, як Рыбак, не таму, што яго не

цэніць. Ён не разумее Рыбака, які выбраў шлях здрады і маладушша. Падводзячы рахункі свайму жыццю ў дваццаць шэсць год, Сотнікаў мае пераананне аб сапраўднай каштоўнасці жыцця. Яно вымяраецца тым добрым і карысным, што чалавек зрабіў для іншых, для грамадства. Сотнікаў застаецца незадаволены зробленым, аднак і марным сваё жыццё не лічыць.

Пасля гібелі Сотнікава нарадзіўся Рыбак-здраднік. Аўтар судзіць свайго героя-здрадніка праўдай і ўзнясеннем Сотнікава, які не спасылаўся на безвыходныя абставіны, бо, сапраўды, нельга ніякімі абставінамі апраўдваць здраду, злачынства.

У творы В. Быкаў-мысляр даводзіць, што часам узнікаюць сітуацыі, з якіх чалавеку няма рэальнага выйсця і вяртання ў жыццё. Але бяссілле чалавека перад абставінамі, трагізм сітуацыі не павінны здымаць з чалавека адказнасці за сябе і за тых, хто побач. Складаныя абставіны, наадварот, падпарадкаванне і памылковы выбар прыводзяць чалавека да маральнага паражэння. У сцвярджэнні гераічнай асобы, якая і ў трагічных абставінах застаецца вернай сабе, — такой асобай быў Сотнікаў — В. Быкаў справядліва сцвярджае высокі гуманістычны ідэал чалавецтва. Быкаўская аповесць уяўляецца разгорнутай мастацка-літаратурнай метафарай салжаніцынскага выслоўя – “Жить не по лжи!»

Час сцірае чалавечыя лёсы, не пакідае нават месцаў пахаванняў замучаных і загубленых пакаленняў. А літаратура стварае ім кнігі-мемарыялы, творы-помнікі. Справядліва высока ацэньваецца праца А. Салжаніцына па стварэнні ўнікальнага ў сусветнай літаратуры трохтомнага выдання *“Архіпелаг ГУЛаг”*, якое яшчэ ў 70-я гг. стала вядома ў краінах Захаду (упершыню выдадзена ў Парыжы, 1973 – 1975 гг.). Да чытачоў Расіі і Беларусі афіцыйна гэта выданне прыйшло значна пазней, амаль праз дваццаць год. Толькі ў 1989 г. ў Савецкім Саюзе пачалі друкаваць творы А. Салжаніцына. Сам А. Салжаніцын даў канкрэтызаваны падзагаловак сваёй кнізе: “Вопыт мастацкага даследавання”. Пісьменнік абнародаваў тое, пра што нельга было гаварыць і пісаць, хоць фармальна “культ асобы” і яго наступствы былі асуджаны ў СССР яшчэ ў 60-я гг. Знямелае ад жахаў сталінскай таталітарнай сістэмы і сапраўднага генацыду супраць свайго народа, савецкае грамадства ўсё яшчэ маўчала.

Асновай кнігі “Архіпелаг ГУЛаг” стаў асабісты вопыт пісьменніка і ўспаміны каля 250-ці вязняў, якія прайшлі жахі сталінскіх лагераў. Па звестках А. Салжаніцына, 21 мільён чалавек былі знішчаны і памерлі з голаду ў працоўных лагерах. Кніга “Архіпелаг ГУЛаг” стала дакументальна-мастацкім даследаваннем савецкай лагернай турэмнай сістэмы 1918 – 1956 гадоў.

У беларускай літаратуры пачынальнікам “гулагаўскай” тэмы стаў пісьменнік-драматург Ф. Аляхновіч (1883 – 1944 гг.). Страшную праўду пра савецкія “исправительно-трудовые лагеря” ён расказаў у аповесці “У кіпцюрох ГПУ”. Гэта кніга ўласных успамінаў аўтара аб высылцы ў Салаўкі, аб працы па дванаццаць гадзін і аб побыце вязняў, аб “лагерных” норавах, якія насаджаліся турэмнай адміністрацыяй.

Страшная праўда аб часах сталінізму адкрыецца значна пазней, у канцы 80-х і ў 90-я гг., у многіх творах і ўспамінах рускіх і беларускіх пісьменнікаў –

А. Салжаніцына, В. Шаламава, Ю. Дамброўскага, А. Рыбакова, С. Грахоўскага, П. Пруднікава, Л. Геніюш, Б. Мікуліча, П. Пруднікава…

В. Быкаў працягваў у беларускай і тагачаснай савецкай літаратуры мастацка-творчае здзяйсненне справы А. Салжаніцына, вяртаў народу праўду аб трагічным эпасе сталінскіх рэпрэсій. Матывы і вобразы бязвінных ахвяр таталітарызму ўзнікаюць ужо ў ранніх аповесцях В. Быкава (напрыклад, вобраз Івана Пшанічнага, аднаго з герояў першай аповесці "Жураўліны крык"), паступова ўзмацняюцца, гістарычна канкрэтызуюцца (паказ даваеннага жыцця беларускага сялянства ў аповесці "Знак бяды"); уздымаюцца да мастацка-філасофскіх даследаванняў антынароднай таталітарнай сістэмы (аповесць "Сцюжа"). Творы В. Быкава ўзнаўляюць трагедыі беларускага народа, нацыянальнай інтэлігенцыі і сялянства, жыцці якіх праглынуў ГУЛаг.

Аповесць *В. Быкава "Аблава" (1988)* стала пераканаўчым мастацка-сімвалічным абагульненнем і адначасова бязлітаснай высновай пісьменніка аб драматычным лёсе беларускага народа ў XX ст. Вяртаючы так неабходную грамадству праўду жыцця, В. Быкаў стварыў твор-помнік, у якім увекавечыў памяць аб беларускіх сялянах, ахвярах сталінізму. Хведар Роўба, герой аповесці В. Быкава "Аблава", цягавіта і трывушча, як Іван Дзянісавіч, вядомы герой А. Салжаніцына, працаваў на лесапавале, цярпеў лагерны лёс. Але пасля смерці жонкі і дачушкі, якія былі высланы з ім, жыццё страціла для быкаўскага героя сэнс. Адзінае, што яго яшчэ цікавіць у лагерным існаванні, што ж змянілася ў яго роднай вёсцы, што стала калгаснай, што з яго хатай і як жыве яго сын Міколка, які ў час высылкі бацькоў служыў у савецкім войску?..

Пісьменнік з вялікай мастацкай глыбінёй асэнсоўвае трагедыйнасць айчыннай гісторыі, паказвае гвалтоўную і пакутлівую для сялян калектывізацыю. Аповесць выразна даносіць сучаснаму чытачу аўтарскае перакананне аб антымаральнасці таталітарнай сістэмы, якая не толькі фізічна знішчала мільёны, але і расчалавечвала людзей, вынішчала маральнасць пачуццяў нават між самымі роднымі, сямейнікамі. Гэта ці не самае страшнае злачынства той палітычнай сістэмы. Па дарозе ўцёкаў з чужога краю, з паўночнага Котласу, дзе навекі засталіся жонка і дачка, Хведар успамінае перажытае. Праз успаміны героя пісьменнік расказвае чытачу аб калектывізацыі і трагічным лёсе сялян-гаспадароў. Хведар намагаецца знайсці адказ на пытанне, за што ж ён быў асуджаны і пакараны, і не знаходзіць. "Тысячу разоў ён пытаўся ў сябе, як ехалі ў смярдзючых вагонах, як іх гналі абозам па замерзлай рацэ, як рабіў там, на паўночным прыгоне, – пытаўся ў людзей, знаёмых і незнаёмых, пытаўся ў начальнікаў. Усе нешта казалі пра ўладу, класавую барацьбу і калектывізацыю. Але ніхто яму не растлумачыў так, каб адразу стала зразумела: завошта ў яго адабралі ўладай жа дадзеную зямлю, майно і саслалі на катаргу?.." [2, с. 332 ].

На роднай зямлі, у роднай вёсцы з красамоўнай назвай Нядолішча ад яго адцураліся суседзі і аднавяскоўцы, якія яго ведалі змалку, якім ён мноства разоў дапамагаў, жыў у добрым суседстве. Кожны з іх баяўся трапіць у няміласць да ўлады, таму і не асмельваліся нават паспачуваць раскулачаным: "Мусіць, навек адышла дабрыня з мінулым часам, на змену ёй паявілася нешта

новае – жорсткае і няшчаднае” [2, с. 361]. Пісьменнік падкрэслівае разбуральнасць, амаральнасць таталітарнай сістэмы і “новай” ідэалогіі. Хведара абманвалі, ашуквалі суседзі, начальства і нават радня. Ён быў нязручным усім прыстасаванцам, якія імкнуліся да ўлады. Сваёй штодзённай працай ён паказваў перавагу чалавека-гаспадара над балбатунамі-актывістамі, якія кіруюць калгасам.

Праз трагедыю ні ў чым не павіннага чалавека В. Быкаў паказвае трагедыю ўсяго сялянства, бесчалавечнасць палітыкі “ліквідацыі кулацтва”, што прывяло да разарэння вёскі, знішчэння сапраўдных гаспадароў і знішчэння веры сялян быць гаспадарамі на сваёй зямлі.

Але самыя страшныя падзеі сталіншчыны – гэта руйнаванне маралі і нават роднасці, што бязлітасна прайшло па многіх сем’ях. Ад Хведара адмовіўся яго родны сын Мікола. У дзяцінстве сын быў працавіты, спачувальна ставіўся да людзей і жывёлы. Але, падросшы, уступіў у камсамол, стаў сакратаром ячэйкі, стала не да гаспадаркі. Пасля вяртання з войска хлопей нават не пацікавіўся, куды выслалі бацькоў і што з імі. Мікола стаў “партыйным сакратаром” у раёне і нават адмовіўся ад бацькавага прозвішча. Бацька трывожыцца: чаму сын стаў нелюдзем? Ён жа вучыў яго спагадзе. Але былі ў Міколы і іншыя настаўнікі – тагачасныя савецкія ідэолагі. Ніхто не перасцярог хлопца, апантанага “новымі” ідэямі, што нельга, грэх адракацца ад бацькоў, ад свайго роду.

Сын ідзе супраць бацькі. У аблаве на ўцекача Хведара Роўбу, сумленнага і працавітага чалавека, удзельнічаюць суседзі, аднавяскоўцы. Аўтар падае думкі героя ў апошнія хвіліны жыцця, перад тым, як яму назаўсёды знікнуць у твані: “Людцы, завошта вы так? Што я зрабіў кепскае вам? … Завошта ж мяне так люта? … Людцы, адумайцеся!.. Бедны Міколка! І яму во лезці сюды! Мусіць, аднак, не ад салодкай жызні! … Можа, яму загадалі?.. І паслалі лавіць у лесе бацьку, якога ён выракся. Калі выракся, дык, мабыць, можна і лавіць. Але калі такое магчыма, тады як жа жыць? Можа, яму яшчэ загадаюць, злавіўшы, учыніць допыт над бацькам? І сын змушаны яго катаваць? Божа, нашто ты стварыў тады белы свет! ” [2].

Аповесць В. Быкава “Аблава” ўспрымаецца мастацкім рэквіемам па тысячах бязвінна загубленых беларускіх сялян у час сталінскіх рэпрэсій. Замоўчванне трагічных старонак айчыннай гісторыі В. Быкаў, як і А. Салжаніцын, расцэньваў як хваробу духу грамадства. Абодва пісьменнікі прынцыпова парушалі “зону хлуслівага маўчання” (В. Быкаў). Старонкі іх кніг і сёння прымушаюць думаць і трывожыцца, каб не паўтарыліся трагічныя гістарычныя тупікі грамадства ў будучыні.

**Спіс літаратуры:**

1. Быкаў, В. Збор твораў : у 4 т. / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1982. – Т. 4 : Аповесці. Апавяданні – 479 с.
2. Быкаў, В. У тумане : аповесці / Маст. У. Сытчанка. – Мн. : Маст. літ., 1989. – 383 с.